## Народ. Прэзідэнт. Урад

### А. ЛУКАШЭНКА: АБАРОНА АЙЧЫНЫ АД НОВЫХ ПАГРОЗ І ВЫКЛІКАЎ МАЕ ПЕРШАРАДНАЕ ЗНАЧЭННЕ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да воінаў-інтэрнацыяналістаў, ветэранаў вайны ў Афганістане з нагоды Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, які адзначаўся ў Беларусі 15 лютага, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

“Падзяляючы боль страты, мы шчыра спачуваем тым, хто не дачакаўся сваіх сыноў, мужоў, братоў, - адзначыў Прэзідэнт. - Савецкія салдаты з гонарам выконвалі свой абавязак у Афганістане, не здрадзіўшы прысязе, часта цаной уласнага жыцця. Імкнучыся ўсталяваць мір у змучанай крывавым разладам краіне, нашы байцы праявілі мужнасць і гераізм. Многія з іх адзначаны баявымі ўзнагародамі”.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, сучасны свет не стаў больш добрым, спакойным і бяспечным, колькасць “гарачых” пунктаў на зямным шары не змяншаецца. “Таму абарона Айчыны ад новых пагроз і выклікаў заўсёды мае першараднае значэнне. Тым больш важкім становіцца ваш бясцэнны вопыт, набыты ў лакальных канфліктах. Вы ўносіце значны ўклад у падтрыманне стабільнасці ў грамадстве, выхаванне патрыятызму ў моладзі, з’яўляецеся прыкладам для падрастаючага пакалення”, - гаворыцца ў звароце.

### У МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ - СВОЙ ГЕРАЛЬДЫЧНЫ ЗНАК-ЭМБЛЕМА

Прэзідэнт Беларусі сваім указам заснаваў геральдычны знак-эмблему Міністэрства аховы здароўя і нагрудны знак адзнакі міністэрства «Ганаровы донар Рэспублікі Беларусь». Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Рашэнне прынята ў мэтах захавання і развіцця гістарычных традыцый Міністэрства аховы здароўя, а таксама стымулявання донарскага руху.

Указам зацверджаны палажэнні аб знаках, іх апісанне і відарыс.

### ЗНЯТЫ АБМЕЖАВАННІ І ЗАБАРОНЫ НА ВЫВАЗ ГРАМАДЗЯНАМІ СПАЖЫВЕЦКІХ ТАВАРАЎ

Беларусь зняла з 15 лютага 2012 года ўсе абмежаванні і забароны на вываз фізічнымі асобамі спажывецкіх тавараў за мяжу. Аб гэтым заявіў начальнік упраўлення арганізацыі мытнага кантролю ДМК Беларусі Уладзімір Арлоўскі.

Уладзімір Арлоўскі паведаміў, што пастанова Савета Міністраў ад 6 лютага 2012 года нумар 124 прызнае страціўшай сілу пастанову ад 11 чэрвеня 2011 года нумар 755 «Аб некаторых мерах па абароне спажывецкага рынку». Гэтай пастановай быў зацверджаны пералік тавараў і нормы іх вывазу фізічнымі асобамі, пры перавышэнні якіх падлягаў выплаце спецыяльны збор. Таксама быў прыняты пералік тавараў, часова забароненых для вывазу фізасобамі.

Уладзімір Арлоўскі нагадаў, што пастанова Саўміна нумар 755 была прынята ў мэтах забеспячэння эканамічнай стабільнасці дзяржавы, стварэння ўмоў для набыцця жыхарамі рэспублікі сацыяльна значных тавараў. Быў устаноўлены спецыяльны збор у адносінах да асобных тавараў пры вывазе іх з Беларусі фізічнымі асобамі звыш устаноўленых норм. На асобныя катэгорыі тавараў, напрыклад, крупы, макаронныя вырабы, іншыя прадукты харчавання, была ўстаноўлена забарона на вываз. Таксама гэта датычылася цыгарэт, бытавой тэхнікі. “Названыя нормы мелі часовы характар і былі накіраваны на прадухіленне спекуляцыі сацыяльна значнымі таварамі на ўнутраным рынку краіны і недапушчэнне бескантрольнага іх вывазу за межы Беларусі”, - сказаў прадстаўнік ДМК.

У час дзеяння пастановы праводзіўся пастаянны маніторынг насычэння спажывецкімі таварамі беларускага рынку, адсочваўся вываз тавараў за межы краіны. “Прынятыя меры эканамічнага і арганізацыйнага характару далі магчымасць скараціць розніцу ў цэнах на сацыяльна значныя тавары ў рэспубліцы і за яе межамі. Акрамя таго, стабілізаваўся курс нацыянальнай валюты”, - адзначыў Уладзімір Арлоўскі.

Што датычыцца вывазу аўтамабільнага паліва за межы рэспублікі, то на яго абмежаванні застаюцца, падкрэсліў начальнік упраўлення ДМК. Кантроль за вывазам паліва ўстаноўлены пастановай Саўміна нумар 753, якая была прынята ў чэрвені 2011 года.

**Па матэрыялах БелТА.**

## Изменения пенсионного законодательства в пенсиях за особые заслуги перед Республикой Беларусь

**Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 13 октября 2011 года №1367 внесены изменения и дополнения в Положение о пенсиях за особые заслуги перед Республикой Беларусь. Настоящим Положением определены условия и порядок установления (пересмотра размера) и выплаты пенсии за особые заслуги перед Республикой Беларусь.**

Право на пенсию за особые заслуги имеют граждане, проживающие на территории Республики Беларусь, получающие пенсию по возрасту, по инвалидности, за выслугу лет в соответствии с Законом Республики Беларусь от 17 апреля 1992 года «О пенсионном обеспечении» или пенсию за выслугу лет в соответствии с Законом Республики Беларусь от 14 июня 2003 года «О государственной службе в Республике Беларусь» и имеющие особые заслуги перед Республикой Беларусь:

- получающие пенсию по возрасту или за выслугу лет - по достижении возраста мужчинами 60 лет, женщинами 55 лет;
- получающие пенсию по инвалидности - независимо от возраста.

Пенсия за особые заслуги устанавливается:

- Героям Беларуси, Героям Советского Союза, Героям Социалистического Труда;
- гражданам, награжденным орденами Отечества трех степеней, орденами «За службу Родине» трех степеней, орденами Славы трех степеней, орденами Трудовой Славы трех степеней, орденами «За службу Родине в Вооруженных Силах СССР» трех степеней;
- гражданам, награжденным тремя и более орденами Республики Беларусь и (или) СССР;
- гражданам, удостоенным почетных званий Республики Беларусь, БССР или СССР (народный, заслуженный);
- лауреатам Государственных премий Республики Беларусь, БССР, Ленинской и Государственной премий СССР;
- гражданам, занимавшим высшие государственные должности Республики Беларусь, членам Правительства Республики Беларусь, председателям облисполкомов и Минского горисполкома - после прекращения ими работы в указанных должностях;
- победителям и призерам олимпийских, паралимпийских, дефлимпийских игр, чемпионам мира и Европы;
- командирам, комиссарам, начальникам штабов партизанских бригад и отрядов.

Пенсия за особые заслуги не устанавливается гражданам, имеющим судимость.

По вопросу назначения или пересмотра размера пенсии за особые заслуги необходимо обращаться в управление по труду, занятости и социальной защите райисполкома.

**Наталия СТАШКО,**
**начальник отдела пенсий и пособий управления по труду, занятости и социальной защите райисполкома.**

## А памяць жыве...

Кожны год 15 лютага мы ўспамінаем тых, хто змагаўся ў бязлітасным Афганістане. Для многіх беларусаў гэта дата засталася ў памяці як дзень заканчэння страшэннай вайны. Сёлета была адзначана дваццаць трэцяя гадавіна выводу савецкіх войскаў з Афганістана.

У гэты дзень у актавай зале музычнай школы прайшло ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, а пасля былыя салдаты і афіцэры сабраліся ля помніка, каб ускласці кветкі і вянкі. У памяць аб загінуўшых прагучаў урачысты залп.

**Таццяна ЧАРНЯЎСКАЯ.**
**Фота аўтара.**





**Даніна памяці: намеснік старшыні райвыканкама Генадзь БЫЧКО і старшыня райвыканкама Мечыслаў ГОЙ.**

■ *ІДЭАЛАГІЧНАЯ РАБОТА*

## Слова вядзе да справы



У мінулую пятніцу аддзел ідэалагічнай работы райвыканкама правёў семінар-нараду з намеснікамі кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый раёна па ідэалагічнай рабоце. Падсумаваў вынікі сумеснай дзейнасці аддзела ідэалагічнай работы, курыруемых структур і падведамасных фарміраванняў у 2011 годзе і вызначыў задачы на 2012 год начальнік аддзела ідэалагічнай работы райвыканкама Аляксей Апановіч.

Сваімі напрацоўкамі і вопытам інфармацыйна-выхаваўчай, ідэалагічнай работы ў працоўных калектывах падзяліліся намеснікі кіраўнікоў па ідэалагічнай рабоце: Надзея Старавойтава - завод аптычнага станкабудавання; Ларыса Банцар - агрэгатны завод; Васіль Ціхановіч - камбінат хлебапрадуктаў; Людміла Градзіцкая - “Смаргоньсілікатабетон”; Ларыса Забрамская - будаўнічамантажны трэст №41; Ганна Адамовіч - СВК “Саўбел”.

У рабоце семінара-нарады, які праходзіў зацікаўлена і жыва, у форме свабоднага абмену думкамі за “круглым сталом” актыўна ўдзельнічалі намеснік начальніка ўпраўлення ідэалагічнай работы Гродзенскага аблвыканкама Ірына Сцепаненка і намеснік старшыні Смаргонскага райвыканкама Генадзь Бычко.

Плённая дзейнасць аўтарытэтных, вопытных прапагандыстаў-выхавальнікаў у сваіх працоўных калектывах і грамадскіх справах была адзначана адпаведнымі ўзнагародамі.

**Ян ІВАНЧЫК.**

*(Больш падрабязная справаздача з гэтага мерапрыемства будзе апублікавана ў бліжэйшым нумары газеты).*

■ *АКТУАЛЬНО*

## Спрашивали? Отвечаем

**Во время единых дней информирования, которые регулярно проводятся в коллективах, продолжают поступать вопросы от населения. На большинство из них уже получены ответы.**

***- Запрещена ли парковка транспортных средств на зеленой зоне?***

- Согласно главе 19 Указа Президента Республики Беларусь от 28 ноября 2005 г. №551 «О мерах по повышению безопасности дорожного движения» остановка и стоянка транспортных средств на газонах и других участках с зелеными насаждениями запрещается. Напоминаем также, что остановка и стоянка транспортных средств запрещается:

- на проездах во дворах со стороны, прилегающей к жилой застройке;
- в местах, где стоящее транспортное средство создаст препятствие для движения, работы транспортных средств оперативного назначения и транспортных средств дорожно-коммунальных служб (въезды во дворы и выезды из них, проезды в арках, узкие местные проезды, места размещения контейнеров для сбора бытовых отходов и др.);
- ближе 10 метров от служебных дверей магазинов, через которые производятся погрузочно-разгрузочные работы, закрытых ворот, в том числе ворот гаражей.

При нарушении водителями предусмотренных настоящей главой правил остановки или стоянки транспортных средств, в результате которого создано препятствие для дорожного движения или возникла угроза безопасности граждан, работники ГАИ вправе произвести принудительную эвакуацию таких транспортных средств в порядке, установленном законодательными актами и Инструкцией о порядке принудительной эвакуации транспортных средств, утверждаемой Советом Министров Республики Беларусь.

***- Каковы правила выгула собак?***

- Владельцы собак, кошек обязаны зарегистрировать своих питомцев в течение трех дней после приобретения. При регистрации проводится ознакомление владельцев с правилами содержания домашних животных. При этом обращается внимание на то, что выгуливать животных необходимо в специально отведенных для этого местах. Нарушение правил содержания собак и кошек влечет предупреждение или наложение штрафа в размере от 1 до 15 базовых величин.

***- Как начисляется оплата за лишние квадратные метры в квартире?***

- Согласно Постановлению Министерства ЖКХ Республики Беларусь №13 от 24 мая 2004 г. «Об утверждении инструкции о порядке оплаты населением жилищно-коммунальных услуг» потребители жилищно-коммунальных услуг производят оплату за техническое обслуживание по установленным ставкам и (или) по нормативной себестоимости содержания 1 кв. метра общей площади жилых помещений.

По установленным ставкам производится плата за техническое обслуживание:

- в пределах 20 кв.метров общей площади на каждого проживающего (прописанного) в жилом помещении члена семьи нанимателя, собственника, члена организации граждан-застройщиков, в том числе временно отсутствующего по основаниям, установленным в подпункте 1.7 пункта 1 постановления Совета Министров Республики Беларусь от 25 августа 1999 г. №1332 «Об упорядочении расчетов населения за пользование жилыми помещениями и коммунальными услугами» (в редакции постановления Совета Министров Республики Беларусь от 31 января 2001 г. №128) (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 1999 г., №68, 5/1526; 2001 г., №17, 5/5199), и 10 кв. метров общей площади на всю семью, а также полученной в соответствии с законодательством дополнительной площади жилых помещений в размере до 20 кв. метров;
- в однокомнатных квартирах (за исключением перестроенных и построенных по индивидуальным проектам);
- в квартирах, заселенных несколькими потребителями жилищно-коммунальных услуг, расположенных в многоквартирных жилых домах;
- неработающими пенсионерами при достижении женщинами 55 лет, мужчинами 60 лет, инвалидами I и II группы, проживающими отдельно от трудоспособных членов семьи, независимо от размера занимаемых жилых помещений.

По нормативной себестоимости, утверждаемой областными исполнительными комитетами, Минским городским исполнительным комитетом, плата взимается за техническое обслуживание остальной площади жилых помещений, в том числе в перестроенных и построенных по индивидуальным проектам однокомнатных квартирах.

**Подготовила Татьяна ЧЕРНЯВСКАЯ.**

■ *НА СЛУЖБЕ АЙЧЫНЕ*

# Смаргонскі падводнік



**У Пятра Гурскага ёсць аўтамабіль, і ён на ім ездзіць. Але ад гэтага асаблівага задавальнення не зведвае. А вось на веласіпедзе любіць пракаціцца. Прычым больш падабаецца мужчыну націскаць на педалі ў халаднаватае ветранае надвор'е. Не перашкода, калі крыху накрапвае дождж. Таму ў непагадзь падначаленыя Пятра Пятровіча, якія нясуць службу на аб'ектах у горадзе і сельскай мясцовасці, звычайна кажуць: "Трэба чакаць Гурскага". І ён сапраўды неўзабаве паяўляецца, каб праверыць, як наладжана вартаўнічая ахова.**

Гэта цяпер Пётр Гурскі працуе начальнікам аховы ўчастка і жыве ў Смаргоні. А калісьці лёс закінуў яго на край свету, дзе бушуе, кідае на бераг магутныя хвалі вялікі Ціхі акіян. Напэўна, падсвядомае задавальненне ад неспрыяльнага надвор'я ў мужчыны з таго часу. Ён аддаў 15 гадоў воднай стыхіі. Служыў старшыною каманды электрыкаў на атамным ракетным падводным крэйсеры стратэгічнага прызначэння.

Сёлета споўніцца 33 гады, як Гурскага прызвалі ў армію. Па камсамольскай пуцёўцы трапіў тады на Балтыйскі флот. Разам з ім у тых мясцінах апынуліся яшчэ 3 прызыўнікі са Смаргонскага раёна. Хлопцаў накіравалі ў марскую пяхоту. Але ў гэты час там з'явіліся "купцы", якія прапаноўвалі добраахвотнікам з ліку матросаў перавесціся ў вучэбны Чырвонасцяжны атрад падводнага плавання імя Кірава.

Пётр тады ўжо ведаў пра названы вышэй атрад, бо яго сястра была замужам за падводнікам. Швагер прыязджаў у Смаргонь. Прычым у форме. Расказваў пра марскія паходы. І падлетку Пятру захацелася таксама, па магчымасці, трапіць служыць на падводную лодку.

Цяпер жа ён стаяў разам з сябрам з Ракаўцаў у курылцы. Абодва апранутыя ў марскую форму чакалі адпраўкі ў Югаславію. У гэты час міма іх па калідоры прайшлі "купцы". Пётр Гурскі пабег услед за імі, пачаў прасіць: "Вазьміце мяне. Я хачу стаць падводнікам". Незнаёмцы запісалі яго імя і прозвішча, потым прамовілі: "Такога настойлівага ахвотніка бачым упершыню. Іншых ходзім, угаворваем. А гэты сам просіцца".

Жадаючых перайсці ў падводнікі набралася 102 чалавекі. Праходзілі камісію. Патрабаванні былі вельмі строгія. У лістападзе 1979 года ўсіх, хто вытрымаў выпрабаванні, павязлі ў Ленінград, дзе была школа тэхнікаў-мічманаў. Два гады вучобы па спецыяльнасці тэхнік-электрамеханік суднавага электраабсталявання, потым уручэнне дыпломаў, новай формы і корцікаў, накіраванне да месцаў далейшага праходжання службы на флоце.

Пётр Гурскі вучыўся "на выдатна", хацеў трапіць на Паўночны флот, але яму выпала размеркаванне на Ціхаакіянскі. Там чакала атамная падводная лодка з грознаю назвай "Барс". І трэба ж было такому здарыцца, што ў гэты час на ёй служыў смаргонец, нават сусед Гурскага па вуліцы Чырвонаармейскай Анатоль Аблавацкі. Больш таго, землякі дзяжурылі ў адну змену на адным пульце 6 гадоў. Аблавацкі быў старэйшы за Гурскага, дапамагаў яму асвоіць спецыяльнасць, падтрымліваў маральна.

З 15 гадоў службы на флоце Пётр Гурскі 4 гады знаходзіўся ў плаванні. Нават калі лодка стаяла на базе, афіцэраў і мічманаў дамоў не пускалі. Жонак і дзяцей яны бачылі толькі падчас водпуску. Іншым разам мужчынам дазвалялі адлучыцца толькі з 22 гадзін да світання. Раніцай члены экіпажа павінны былі з'явіцца на падняцце сцяга.

Пётр Пятровіч прызнаўся, што з Далёкага Усходу яго вельмі цягнула ў Смаргонь. Прыязджаў сюды адзін раз у два гады. Водпуск давалі вялікі - тры месяцы. З'яўленне сына дома радавала бацькоў. Другі іх старэйшы сын таксама быў ваенным і не меў асабліва часу наведвацца ў родныя мясціны.

Сваю жонку Пётр Гурскі называе марачкай. Прычым паўнапраўнай, бо пражыла яна на Далёкім Усходзе 12 гадоў. Там нарадзіліся і выраслі дзеці - дзве дачкі. Выхоўвала іх жонка, пакуль муж быў у плаванні. Чакала і падтрымлівала яго. Таму галава сям'і ўдзячны жонцы. Падкрэсліў, што без яе яму нашмат цяжэй было б на службе.

**Юрый ЯНУШКЕВІЧ.**
**Фота Міхаіла РАЗУМНІКА.**

МТБанк
ДЕЛАЕМ ЖИЗНЬ ЛЕГЧЕ

**Акция от МТБанка**

**«Поддержим мужчин» - супер-скидки на кредиты к праздникам!**



*На вопросы читателей отвечает Начальник ЦБУ №6 Ольга Карнаух.*

**- Слышал, что МТБанк снизил ставки по кредитам. Неужели это правда?**

- Да, в период с 1 февраля по 10 марта МТБанк проводит акцию «Поддержим мужчин» для того, чтобы вы смогли оформить кредит на потребительские нужды по ставке всего лишь от 15% годовых! Таким образом подготовка к праздникам принесет вам только положительные эмоции!

**- Получается, что по этой акции скидки только для мужчин?..**

- Вовсе нет! Оформить документы на такой кредит может любой желающий! Ведь не только наши мужчины заботятся о нас – женщины тоже преподносят подарки своим любимым! Поэтому мы специально выбрали период самых романтических праздников – 14 февраля, 23 февраля, 8 марта – для того, чтобы порадовать своих Клиентов скидками!

**- А можно во время действия акции оформить кредит без справки о доходах?**

- Да, конечно, такая возможность есть! Без справки о заработной плате вы можете оформить до 10 500 000 рублей сроком до 2 лет. Таким образом, вам не придется тратить время на оформление документов!

**- Скажите, какую сумму я могу получить в кредит?**

- Размер кредита зависит от вашего дохода, но максимальная сумма по кредиту наличными составляет 40 000 000 рублей на срок до 4,5 лет. Кредиты на потребительские нужды в МТБанке оформляются без поручителей и без комиссий и штрафов за досрочное погашение!

**- Как можно оформить документы на кредит?**

- Кредиты в рамках акции «Поддержим мужчин» можно оформить в любом отделении МТБанка, просто позвонив по телефонам нашей горячей линии **+ 375 (17) 229 99 99** и с мобильного **509 99 99** (Велком, МТС, Life:)) или оформив заявку на нашем сайте www.mtbank.by

***Отделения МТБанка работают без выходных!***

**Спешите стать участником нашей акции и оформить кредит на самых выгодных условиях! Акция «Поддержим мужчин» действует только до 10 марта!**

**Г. Гродно, ул. Антонова, 31, г. Гродно, ул. Советская, 18.**
**8 (0152) 75 84 06, 8 (029) 341 15 38.**
®

# Блистать умом и сапогом

**Этот праздник многие ребята полюбили еще в детстве. В день 23 февраля девчонки-одноклассницы резко становились менее задиристыми, на шутки и дерганья за косички реагировали не так язвительно и в рюкзаках под партами прятали приготовленные для мальчиков подарки. Тогда никто не спрашивал, защищал ли ты Родину и держал ли хоть раз в руках автомат. А если бы спросили? Было стыдно ответить «нет»...**




**Младший сержант Максим НАЗАРОВ.**



**В бытовой комнате Евгений ПИНЧУК и Владислав ИВАНОВ.**

Теперь этих ребят никто не посмеет упрекнуть в том, что День защитников Отечества они отмечают не совсем заслуженно. Нынешние курсанты Института пограничной службы – это будущие офицеры. Уже сегодня они постигают азы пограничной службы, и у каждого из них уже есть четкое представление о том, как защищать Родину и ее священные рубежи.

Уже второй год в нашем районе на территории бывшей в/ч 1259 обучаются курсанты Института пограничной службы. 1 августа 2011 года сюда прибыло 120 юношей. Все они – бывшие одиннадцатиклассники, которые успешно выдержали все испытания и были зачислены в ряды первокурсников. Целый месяц длилась подготовка парней к военной присяге, а с 1 сентября у них начались занятия.

Жизнь курсантов суровой не назовешь, однако в институте, как в армии, все строго. День молодого бойца расписан поминутно. Подъем, зарядка, утренний туалет... Все согласно режиму. Некоторые из курсантов, то ли разочаровавшись в выбранной профессии, то ли не выдержав новых для них условий, решили прекратить обучение. Так, из 120 человек осталось 112.

В институте созданы все условия для того, чтобы жизнь курсантов была комфортной. В казарме провели ремонт, полностью заменили мебель. Теперь там новые кровати, табуретки и тумбочки. В спальном отделении чисто и уютно. Рядом находятся бытовые комнаты и сушильные помещения. Здесь курсанты «работают» над своим внешним видом. Первое время на глажку формы и подшивание воротничков уходило много времени. Иголка не хотела слушаться, и утюг, казалось, был не способен вмиг разгладить все складки. Однако со временем все стало получаться само собой.



**Курсанты Алексей МЕРГУРЬЕВ, Артем ШОПИК, Алексей СТЕЛЬМАХ в компьютерном классе.**



**Младший сержант Алексей КРУКОВСКИЙ, Вячеслав ДАРАНЕВИЧ и Олег ТРОФИМОВ на занятиях по лыжной подготовке.**

В отличие от армии, где действует принцип «умом ты можешь не блистать, но сапогом блистать обязан», здесь все немного не так. Блеск сапог никто не отменял, однако и «блеск» ума тоже. Институт пограничной службы в первую очередь – учебное заведение со свойственной ему системой обучения. Ежедневно, кроме воскресенья, с 8.30 до 14.20 курсанты находятся на занятиях. Каждый день у них проводятся по четыре пары. После обеда отводится время на самоподготовку. Его достаточно, чтобы проработать полученный на лекциях материал, сходить в библиотеку за дополнительной литературой, одним словом, подготовиться к завтрашним занятиям.

- Следуя примеру отца, я с детства мечтал быть военным, – рассказывает курсант Максим Назаров. – Пару лет назад определился, что хочу быть именно пограничником. За полгода обучения здесь ни разу не усомнился в правильности своего выбора. Я с детства коллекционировал военную атрибутику, мне было интересно все, что связано с армией. И вот задуманное осуществилось. Приехав сюда, я словно попал в другую среду обитания, где все интересно, я бы даже сказал завораживающе...

Курсант продолжал делиться впечатлениями, его рассказ все больше и больше наполнялся яркими эпитетами. Однако, не разглядев в моих глазах ожидаемого понимания, Максим прервал свой живописный рассказ и с улыбкой добавил: «...но вам, гражданским, этого не понять».

**Татьяна ЧЕРНЯВСКАЯ.**
**Фото Михаила РАЗУМНИКА.**